**СІНТАКСІС** (ад грэч. *syntaxis* ‘пабудова, парадак, спалучэнне’) – 1) раздзел мовазнаўства, які вывучае сінтаксічныя адзінкі, сінтаксічныя паняцці, сінтаксічныя адносіны і сінтаксічныя сродкі; 2) адзін з узроўняў мовы, на якім паводле пэўных заканамернасцяў з дапамогай пэўных сродкаў арганізуюцца сінтаксічныя адзінкі з характэрнымі для іх функцыямі. Змест сінтаксісу: сінтаксічныя адзінкі, заканамернасці і спосабы іх утварэння, магчымасці іх спалучэння і функцыянавання ў тэксце.

Задачы сінтаксісу: а) апісанне тыпаў словазлучэнняў (гл. **СЛОВАЗЛУЧЭННЕ**), тыпаў сказаў і іх структурных частак (гл. **СКАЗ**, **ПРОСТЫ СКАЗ**, **СКЛАДАНЫ СКАЗ**); б) вывучэнне сродкаў сувязі кампанентаў сінтаксічных адзінак (гл. **СРОДКІ ВЫРАЖЭННЯ СІНТАКСІЧНАЙ СУВЯЗІ**); в) аналіз сродкаў і спосабаў аб’яднання словазлучэнняў і сказаў у складанае сінтаксічнае цэлае, тэксты (гл. **СКЛАДАНАЕ СІНТАКСІЧНАЕ ЦЭЛАЕ**, **ТЭКСТ**); г) даследаванне ўзаемасувязі формы сінтаксічных адзінак і іх зместу.

Сінтаксіс – самы высокі ўзровень у сістэме мовы. Менавіта сінтаксісу належаць тыя моўныя адзінкі, якія непасрэдна служаць для зносін людзей і непасрэдна суадносяць інфармацыю з навакольнай рэчаіснасцю.

Сказ як адзінка найвышэйшага сінтаксічнага ўзроўню мовы выконвае сваю асноўную камунікатыўную функцыю толькі ў цеснай сувязі з адзінкамі ніжэйшых узроўняў. Фармальна сказы будуюцца з улікам граматычнай спалучальнасці розных часцін мовы. Інфармацыйны змест сказаў фарміруецца не толькі іх граматычнай структурай, але і лексічным напаўненнем. Лексічнае значэнне знамянальных слоў – аснова лексічнай семантыкі сказа.

Найбольш цесна сінтаксіс звязаны з марфалогіяй, аднак ён мае сувязь з фаналогіяй: фанетычныя сродкі (інтанацыя) афармляюць сінтаксічныя канструкцыі. Так, пры інтанацыйнай завершанасці і адпаведным лагічным націску паміж кампанентамі словазлучэння могуць выражацца прэдыкатыўныя адносіны, якія ператвараюць словазлучэнне ў сказ. Розныя сінтаксічныя адзінкі і розныя аспекты вывучэння сінтаксісу сталі аб’ектамі даследавання ў працах такіх мовазнаўцаў, як Т.П. Бандарэнка, М.Г. Булахаў, Л.І. Бурак, І.Л. Бурак, Н.В. Гаўрош, А.П. Груца, А.І. Наркевіч, В.В. Маршэўская, А.Я. Міхневіч, М.І. Канюшкевіч, Л.П. Падгайскі, В.І. Рагаўцоў, Т.Р. Рамза, П.У. Сцяцко, Н.У. Чайка, Н.М. Чалюк, М.С. Яўневіч і інш.

Асноўныя аб’екты вывучэння сінтаксісу:

**словазлучэнне** – сэнсава-граматычнае аб’яднанне слоў-кампанентаў у сказе, якое звычайна звязана адным з відаў непрэдыкатыўнай сувязі і выражае розныя адносіны паміж прадметамі, дзеяннямі і прыметамі.

**сказ** – мінімальная граматычна і інтанацыйна аформленая адзінка мовы, якая з’яўляецца галоўным сродкам фарміравання, выражэння і паведамлення думак, эмоцый і волевыяўленняў чалавека.

На працягу развіцця лінгвістыкі вылучыліся розныя аспекты (падыходы) апісання сінтаксічных адзінак:

**структурны сінтаксіс** (канструкцыйны, статычны, фармальны) выдзяляе і апісвае сінтаксічныя адзінкі праз адлюстраванне сістэмы сінтаксічных сувязяў у выказванні;

**камунікатыўны сінтаксіс** даследуе актуальнае чляненне, сродкі актуалізацыі інфармацыйнага цэнтра выказвання (гл. **КАМУНІКАТЫЎНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ СКАЗА**);

**функцыянальны сінтаксіс** характарызуе сінтаксічныя адзінкі з пункту гледжання іх функцыянальнага прызначэння;

**семантычны сінтаксіс** разглядае семантычную арганізацыю сінтаксічных адзінак – іх інфармацыйны змест і тыпавое, абагульненае значэнне;

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

**апісальны сінтаксіс** выяўляе і апісвае ў сінхронным плане тыпы словазлучэнняў і сказаў, іх агульныя функцыі і значэнне;

**гістарычны сінтаксіс** аналізуе змены ў сінтаксічным ладзе мовы ў працэсе яе развіцця;

**сінтаксіс тэксту** вывучае заканамернасцміі арганізацыі большых за сказ паведамленняў, якія характарызуюцца сэнсавым адзінствам, агульнасцю тэмы, звязнасцю і структурнай завершанасцю;

**стылістычны сінтаксіс** даследуе выяўленчыя магчымасці сінтаксічных адзінак, іх сінаніміку, ужыванне ў розных стылях;

**паэтычны сінтаксіс** апісвае разнастайныя сінтаксічныя фігуры (параўнанне, паралелізм, перыяд, анафару, эпіфару і інш.);

**аўтарскі сінтаксіс** выяўляе агульнае і адметнае ў арганізацыі выказванняў і тэкстаў пэўных асоб (прамоўцаў, лектараў, летапісцаў, пісьменнікаў).

**Сінтаксічныя адзінкі** – гэта элементы сінтаксічнага ўзроўню мовы, якія адрозніваюцца паводле прызначэння і будовы.

Паводле структурнага крытэрыю адрозніваюць наступныя сінтаксічныя адзінкі:

**сінтаксема** – найменшая сінтаксічная адзінка, структурна-сэнсавы кампанент словазлучэння або сказа: *ад шчасця, са страху, без каня, вада, бацькаў*;

**словазлучэнне** – спалучэнне двух ці некалькіх самастойных слоў, звязаных па сэнсу і граматычна;

**просты сказ** – сказ, які мае адну граматычную аснову – спалучэнне выказніка з дзейнікам або адзін з галоўных членаў;

**складаны сказ** – сказ, які мае дзве і болей граматычныя асновы;

**складанае сінтаксічнае цэлае** (звышфразавае адзінства) – асобная сінтаксічнай адзінка, якая складаецца з некалькіх (не менш чым з двух) сказаў, звязаных сэнсавай цэласнасцю і пэўным відам сувязі (паслядоўнай, паралельнай ці змешанай);

**тэкст** – маўленчае камунікатыўнае ўтварэнне, якое характарызуецца сэнсавай і структурнай завершанасцю і функцыянальна скіравана на рэалізацыю пазамоўных задач.

**Сінтаксічныя паняцці** – паняцці, якія адлюстроўваюць агульныя ўласцівасці, адносіны і сувязі сінтаксічных адзінак.

Асноўнымі сінтаксічнымі паняццямі з'яўляюцца:

**сінтаксічная сувязь** – фармальнае выражэнне адносін паміж сінтаксічнымі адзінкамі або іх кампанентамі, асноўныя віды сувязі – гіпатаксісная і паратаксісная:

***паратаксісная сувязь*** (або злучальная) звязвае граматычна раўназначныя адзінкі або кампаненты;

***гіпатаксісная сувязь*** (або падпарадкавальная) звязвае граматычна нераўназначныя адзінкі і кампаненты;

паратаксісная сувязь рэалізуецца пры аб'яднанні аднародных членаў і частак складаназлучанага сказа, гіпатаксісная сувязь – у падпарадкавальных словазлучэннях і складаназалежных сказах;

**сінтаксічныя адносіны** – гэта адносіны паміж сінтаксічнымі адзінкамі або іх кампанентамі, якія адлюстроўваюць характар структурна-сэнсавых залежнасцей паміж імі;

**сінтаксічнае значэнне** – сукупнасць функцый сінтаксічных адзінак; усё тое, што гэтымі адзінкамі абазначаецца, выражаецца і складае іх змест.

*М.С.Ржавуцкая*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ